ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 11(949) | АЎТОРАК, 16 чэрвеня 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Самым насычаным па колькасці разглядаемых пытанняў было пасяджэнне Савета універсітэта, якое адбылося 4-га чэрвеня. Першымі на парадку дня былі Скарынаўскія чытанні. З кароткімі навуковымі дакладамі выступілі іх лаўрэаты: дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі А.Ф.Васільеў, ст.выкладчык кафедры бухуліку, кантролю і АГД В.В.Кавальчук, дацэнт кафедры геаграфіі Г.М.Каропа, дацэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства У.І.Коваль, дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі А.Р.Міроцін. Ім уручаны Дыпломы лаўрэатаў і грашовыя прэміі.

Затым было разгледжана пытанне аб прадстаўленні міжвузаўскай праграмы фундаментальных даследаванняў "Навуковая спадчына Ф.Скарыны і сусветная культура" (Скарыніяна) на 1999-2003 гг.

Па інфармацыі прарэктара па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях А.П.Кармазіна падведзены вынікі атэстацыі навукова-педагагічных кадраў на саветах факультэтаў.

З новага навучальнага года ва універсітэце прыбавіцца два факультэты. Прынята рашэнне аб адкрыцці факультэтаў замежных моў і правазнаўства. А на факультэце фізічнай культуры адкрыецца спецыялізацыя "Прыкладная псіхалогія".

У сувязі з пачаткам падрыхтоўкі спецыялістаў па экалогіі кафедра геаэкалогіі перайменавана ў кафедру экалогіі.

Савет унёс некаторыя змяненні ў Статут універсітэта.

Прыняты дапаўненні і змяненні ў план навукова-даследчых работ на II квартал 1998 г.

Савет рэкамендаваў навуковыя даклады прафесара У.В.Анічэнкі і дацэнта У.І.Коваля на міжнародны з'езд славістаў.

Былі зацверджаны праграмы кандыдацкіх экзаменаў па некаторых спецыяльнасцях, вучэбны план спецыяльнасці "Псіхалогія". Загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі Р.Р.Лазько рэкамендаваны ў дактарантуру.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны: У.І.Качаткоў -- загадчыкам кафедры палітычнай сацыялогіі, Л.А.Еўтухова -- заг.кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін, А.Ю.Жук і В.М.Верамееў -- дацэнтамі па спецыяльнасці "Біялогія". Кандыдат фізіка-матэматычных навук У.В.Буракоўскі рэкамендаваны БелВАКу на прысваенне вучонага звання дацэнт.

Савет разгледзеў таксама і вырашыў некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## САМАЯ ГАРАЧАЯ СТУДЭНЦКАЯ ПАРА

Вельмі гарачая цяпер пара ў студэнтаў як у прамым, так і пераносным сэнсе: чэрвеньская спякота супала з напружаным рытмам экзамецыйнай сесіі, выпускных дзяржэкзаменаў і абароны дыпломных работ пяцікурснікамі. У вучэбных карпусах пануе атмасфера адказнасці і сканцэнтраванасці — для студэнтаў летняя сесія — перавадная, ад яе вынікаў будзе залежыць іх далейшы лёс, а для выпускнікоў здача дзяржаўных экзаменаў і абарона дыпломных работ — апошні і вельмі важны этап у іх студэнцкім жыцці.

Завяршаецца пяцігадовы шлях да атрымання дыплома высокакваліфікаванага спецыяліста ў Марыны Булавік, выпускніцы эканомфака. На дзяржэкзамене па спецыяльнасці яна атрымала выдатную адзнаку. Гэта ў чарговы раз стала сведчаннем таго, што дзяўчына па праву з'яўлялася стыпендыяткай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## З НАГОДЫ ЮБІЛЕЮ

У канцы першай дэкады чэрвеня адбыліся ўрачыстасці ў Полацкім дзяржаўным політэхнічным універсітэце. Яго калектыў адзначыў 30-годдзе з дня адкрыцця сваёй вышэйшай навучальнай установы, якая цяпер з'яўляецца вядучай на Віцебшчыне. Прывітальны адрас юбілярам дасланы і ад нашага універсітэта.

## ЛЕТА -- ЧАС АДПАЧЫНКУ

Пытанне, дзе правесці свой доўгачаканы водпуск, для нас зараз самае актуальнае. На жаль, мары аб санаторыях і дамах адпачынку не тое што каля мора, але нават каля азёраў і рэк Беларусі, разбіваюцца як аб недахоп у нас матэрыяльных сродкаў, так і аб дэфіцыт гэтых самых пуцёвак. Таму можна ...чыць прыемным сюрпрызам ...я членаў універсітэцкага калектыву магчымасць адправіцца на ўзбярэжжа Чорнага мора, у пансіянат адпачынку ў Сяргееўцы, што пад Адэсай. Тыдзень назад туды паехалі 14 чалавек -- маці з дзецьмі. Часткова кошт пуцёўкі ім аплацілі абком галіновага прафсаюза, універсітэт, астатняя сума -- 2 мільёны рублей унесена самімі ўладальнікамі пуцёвак.

Пансіянат размяшчаецца каля лімана, непадалёку ад мора, дабірацца да якога можна кацерам. Пакоі для адпачываючых -- на 2 і 3 чалавекі з частковымі зручнасцямі. Тэрмін адпачынку -- 18 дзён.

Плануецца заезд у пансіянат і на ліпень. Таму ўсе, хто жадае правесці летні адпачынак ля Чорнага мора, пад Адэсай, павінны падаць заявы ў прафком ГДУ да 25 чэрвеня.

## ПРЭТЭНДЭНТ НА ДЗЯРЖАЎНУЮ ПРЭМІЮ

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі абвясціў у друку саіскальнікаў конкурсу Дзяржаўных прэмій нашай краіны за 1998 год.

Па намінацыі падручнікаў Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь прадстаўлены на конкурсе цыкл і тры навуковыя работы. Сярод іх -- "Педагогіка" для студэнтаў педагагічных вышэйшых навучальных устаноў, аўтарам якой з'яўляецца загадчык кафедры педагогікі нашага універсітэта, доктар педагагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі І. Ф. Харламаў.

## ПА ПРАБЛЕМАХ НАРМАТЫЎНАЙ ЛЕКСІКІ

На філалагічным факультэце прайшла Міжнародная навукова-метадычная канферэнцыя "Перспектывы развіцця і функцыянавання нарматыўнай лексікі", якая ўжо становіцца традыцыйнай. Арганізатары -- кафедры беларускай культуры і беларускай мовы -- зрабілі ўсё магчымае, каб навуковы форум працаваў на належным узроўні.

Уступным словам канферэнцыю адкрыў прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў. На пленарным пасяджэнні з дакладамі выступілі акадэмік А.І.Падлужны і прафесар кафедры беларускай мовы нашага універсітэта У.В.Анічэнка.

Усяго для ўдзелу у канферэнцыі было замоўлена каля 80 выступленняў. Значную колькасць дакладаў прадставілі выкладчыкі філалагічнага факультэта. На секцыйных пасяджэннях навукоўцы абмеркавалі накірункі і стан нацыянальнай тэрміналогіі, праблемы нармалізацыі асобных лексічных адзінак, асаблівасці функцыянавання нарматыўнай лексікі ў вуснай і пісьмовай мове, праблемы выкарыстання беларускай тэрміналогіі пры выкладанні нефілалагічных дысцыплін. З цікавымі і змястоўнымі паведамленнямі выступілі выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў Мінска, Магілёва, Гродна і інш.

На другі дзень удзельнікі канферэнцыі наведалі Веткаўскі музей народнай творчасці.

**Л.КУЗЬМІЧ, дацэнт кафедры беларускай мовы, намеснік дэкана філалагічнага факультэта.**

## СЛАВІСТЫЧНЫЯ СУСТРЭЧЫ

На філфаку адбыліся чарговыя, традыцыйныя "Славянскія славістычныя сустрэчы", якія наладжваюцца кафедрай рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.

Сёлета сустрэча была прысвечана польскай і чэшскай паэзіі. Студэнты першага і другога курсаў, кітайскія навучэнцы, выкладчыкі кафедры слухалі расказы аб Польшчы, яе мове, выдатных мясцінах, а таксама цікавыя паведамленні, легенды аб Чэхіі. Прагучалі вядомыя вершы паэтаў гэтых краін. Сустрэча ажыўлялася польскімі і чэшскімі народнымі песнямі, якія выконвалі другакурсніцы Т.Калашнікава, А.Васільцова, Н.Іванова, А.Дунаева, Г.Каштанава.

А завяршылася мерапрыемства традыцыйным гімнам славянскіх сустрэч.

**Н.КАЛІНІЧЭНКА, студэнтка гр. РБ-23 філалагічнага факультэта.**

## ДОБРАЯ ПРАКТЫКА

Другі год мы вывучаем французскую мову і вельмі ўзрадаваліся магчымасці паспрабаваць свае сілы ў непасрэдных зносінах з выкладчыцай універсітэта з горада Клермон-Феранa мадам Тандарда. Студэнты атрымалі вялікае задавальненне ад гэтай сустрэчы, не кажучы ўжо аб тым, што гэта была добрая практыка ў размове на французскай мове. Мы таксама даведаліся шмат новага і цікавага пра лад жыцця французаў, іх погляды на сям'ю, шлюб, на праблему выхавання дзяцей. Было таксама прыемна ўсвядоміць, што мы дасягнулі вялікіх поспехаў у вывучэнні французскай мовы, канешне ж, дзякуючы нашай выкладчыцы Ніне Паўлаўне Казялец.

**Н.ЧЭРКАС, студэнтка IV курса філалагічнага факультэта.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую паспяховую навуковую і вучэбна-метадычную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі дацэнт *ЛАЗЬКО Рыгор Рыгоравіч* узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

Вынікі конкурсу-97

# ЁСЦЬ НА КАГО РАЎНЯЦЦА

Чарговы рэспубліканскі конкурс на лепшую студэнцкую навуковую работу быў для нашага універсітэта даволі выніковым. З прадстаўленых на конкурс 38 работ 26 былі адзначаны Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Іх аўтарам прысвоена званне "Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў 1997 года". 12 работ рэкамендавана заахвоціць унутры ВНУ.

Найбольшую колькасць работ прадставілі на конкурс фізічны, гісторыка-юрыдычны і матэматычны факультэты -- адпаведна 11, 7 і 5.

Кіраўнікам НДРС трэба звярнуць увагу на якасць конкурсных даследаванняў, так як многія факультэты не маюць работ, узнагароджаных Дыпломамі І і ІІ ступеняў.

Усе работы, узнагароджаныя Дыпломамі Міністэрства адукацыі І, ІІ і ІІІ ступеняў, прэміраваны адпаведна па 800, 500 і 300 тыс.руб. кожная.

Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь І ступені ўзнагароджаны: выпускнік біялагічнага факультэта А.Дышка (нав. кіраўнік прафесар Л.М.Сапегін); выпускніцы эканамічнага факультэта А.Чубукова (нав. кіраўнік дацэнт А.Е.Нікіфараў), І.Асіпенка (нав. кіраўнік дацэнт Т.І.Панова).

Дыпломам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ІІ ступені ўзнагароджаны: выпускнік завочнага факультэта В.Сахарчук (нав. кіраўнік асістэнт С.Г.Шулейка); студэнты ІІІ курса геолага-геаграфічнага факультэта В.Варгетава і А.Курашоў (нав. кіраўнік ст.выкладчык В.Я.Пашук); выпускнік геолага-геаграфічнага факультэта Я.Ісачоў (нав. кіраўнік дацэнт А.М.Гумен). Навуковыя кіраўнікі лепшых студэнцкіх работ узнагароджаны Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і прэміраваны ў памеры па 500 тыс. руб. Вынікі конкурсу былі падведзены на пасяджэнні Цэнтральнага Савета па НДРС, дзе выступіў прарэктар па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін з грунтоўным аналізам навукова-даследчай работы студэнтаў на факультэтах і кафедрах.

Усім удзельнікам рэспубліканскага конкурсу 1998 года па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках неабходна здаць работы ў ЦС па НДРС да 25 чэрвеня 1998 года.

**А.ГАЕЎ, вядучы інжынер НДС.**

# СОЦИАЛЬНАЯ РОЛЬ И ОСОБЕННОСТИ ПОДГОТОВКИ ПСИХОЛОГОВ

## (К 5 выпуску практических психологов в ГГУ)

**В настоящее время система образования нашей республики ощущает большую потребность в психологических кадрах. Должность практического психолога введена в общеобразовательные школы, детские дома, интернаты, детские сады, техникумы, профтехучилища и другие учебно-воспитательные учреждения.**

Профессия практического психолога сейчас очень популярна и престижна. Это объясняется важными, необходимыми и неотложными задачами по формированию личности, которые стоят перед школами и дошкольными детскими заведениями в связи с теми изменениями, которые происходят в общественно-политической, экономической и духовной жизни нашей республики. Кроме того, это обусловлено местом и ролью, которые присутствуют в выполнении этих нелегких задач именно в практической психологии.

Высокая популярность психологической профессии находит свое подтверждение в достаточно быстром росте численности практических психологов в системе образования Республики Беларусь.

Практический психолог -- это специальность, которая базируется на глубоких знаниях общей, детской, возрастной и педагогической психологии, однако и требует от специалиста доскональных знаний теории и практики психологических исследований, основ психометрии, богатого клинического и жизненного опыта, интуиции, знания профессиональных и эстетических норм. Практический психолог обязан иметь профессиональную направленность, которая проявляется не только в глубоких знаниях, но и в доброжелательности, любви к людям, базируется на гуманистических началах; конструктивных способностях предвидеть поведение человека в различных ситуациях и прогнозировать результаты воспитательных воздействий на него. Важное значение приобретают те особенности, которые проявляются в правильном восприятии и понимании психики человека в общем, так и адекватной оценке его психологического состояния в данный момент. Практический психолог обязан иметь определенный уровень развития интеллекта, что проявляется в высоком развитии аналитико-синтетических мыслительных операций, глубине ума и развитой фантазии. В системе его личностных качеств главная роль принадлежит эмоциональной устойчивости.

Таким образом, профессию практического психолога с полным правом можно отнести к профессиям, с которыми может справиться далеко не каждый человек. Поэтому подготовка психолога должна ничинаться с оценки соответствия свойств претендента на эту профессию.

Такую оценку можно дать в процессе профессиональной ориентации и профессиональной консультации, а также организованного профессионального отбора в педагогический ВУЗ. К сожалению, профессиональное консультирование и профориентационная работа практически не проводятся не только в общеобразовательных школах, но и в педгимназиях, лицеях, педклассах. Поэтому абитуриенты при поступлении в педвуз имеют мизерные знания, а чаще вообще не знают об особенностях деятельности практического психолога, его функциях и обязанностях.

Учитывая то, что специфические способности развиваются в процессе деятельности, можно было бы на этапе экспресс-отбора зачислить студента по уровню развития специфических особенностей в одну из трех групп (высокий, средний, низкий), на этой основе осуществляется дифференцированный подход к подготовке практического психолога и тем самым реализовать два этапа профотбора.

**И.ОЛЕВСКАЯ, преподаватель кафедры психологии.**

# ПАВІННЫ ЗАЦІКАВІЦЦА БУДУЧЫЯ ГІСТОРЫКІ

У паўсядзённых клопатах нам вельмі часта не хапае часу спыніцца і паглядзець назад. А што ж было раней, што прайшло? З гэтага пункту гледжання прафесія гісторыка акумулюе ў сабе веды не толькі аб фіксацыі падзей, але і быт, норавы, устоі мінулых гадоў. Для таго, каб сабраць матэрыял аб часах даўно мінулых, студэнты нашага універсітэта выязджаюць у далёкія падарожжы. А часам бывае так, што гісторыя літаральна ляжыць у нас пад нагамі.

У цяперашні час у раёне былой аграбіястанцыі універсітэта (в.Чонкі) кампактна размешчаны дачны кааператыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта. І амаль ніхто не ведае аб тым, што на гэтым месцы некалькі стагоддзяў размяшчаўся жаночы манастыр. Мясцовыя жыхары расказваюць, што ён быў закрыты ў 20-30-ыя гг. Некалькі дзесяцігоддзяў пасля гэтага тут нічога не сеялі і не будавалі. Пра само месца забыліся. За гэты час цагляныя пабудовы поўнасцю разбурыліся да падмурка.

Але ж зямля не жадае захоўваць свае тайны. І на дачных участках пастаяннымі сталі знаходкі рэшткаў ад глінянага посуду, падкоў, нажоў, гільзаў ад зброі. А сёлета былі знойдзены манеты 1738 года і 2 капейкі 1931 г.

На месцы дачных участкаў раскопак, канешне ж, не правядзеш -- прыватная ўласнасць. Але ж сабраць матэраял аб манастыры хоць па расказах мясцовых жыхароў -- пасільная задача для нашых студэнтаў-гісторыкаў. Можа кагосьці зацікавіць гэта тэма?

**А.ДЗЕМІДЗЕНКА, заг. кафедры АСАІ.**

*Вучоба на радасць*

# КАЛІ БУДНІ СТАНОВЯЦЦА СВЯТАМІ

І хто можа ўсумніцца ў вядомым выразе:"Ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела"? Гэта менавіта так, бо вакол столькі ўсяго цікавага, акрамя вучобы. Аб ёй можна ўспомніць, напрыклад, за тыдзень да экзаменаў. Ды і то, спіць студэнт і бачыць, каб хутчэй скончыліся яго мучэнні. Скончыліся практычныя заняткі, да якіх наогул трэба калі-небудзь і падрыхтавацца. А каб да адных практычных рыхтаваліся старанна некалькі тыдняў запар і чакалі іх, дык такога проста не можа быць у прыродзе. Але аказваецца, што можа. Калі вучоба з мукі ператвараецца ў карыснае мерапрыемства, тады выйграюць не толькі студэнты, але і выкладчыкі.

"Раскажыце мне што-небудзь, а я вас, магчыма, выслухаю" -- пад такім "дэвізам" бывае і праходзяць цяжкія для ўсіх заняткі. А каб выкладчык настолькі зацікавіў прапанаваным варыянтам правядзення практычных заняткаў, такое бывае не часта.

У незвычайна-пазнавальнай форме прайшлі заключныя практычныя заняткі па прадмету "Гісторыя літаратуры XVII-XVIII ст." на ІІ курсе філфака ў студэнтаў беларускага аддзялення. Для таго, каб яны запомніліся не толькі па кніжках, студэнтам было прапанавана інсцэніраваць жыццёвую і творчую біяграфію знакамітага французскага драматурга Жана Баціста Мальера.

Прыйшлося, безумоўна, старанна рыхтавацца, але калі ёсць зацікаўленасць, патрачаныя намаганні не праходзяць дарэмна. У спектаклі былі заняты студэнты ўсіх трох груп беларускага аддзялення. А ўдзячнымі гледачамі былі не толькі студэнты, але і выкладчыкі.

Такія мерапрыемствы дапамагаюць студэнтам раскрыць свае таленты і здольнасці. Цудоўнымі сцэнарыстамі і рэжысёрамі праявілі сябе Святлана Каган і Алеся Рак. Расказ аб жыцці і творчасці Мальера праходзіў на фоне летапіснага апавядання, якое перапынялася інсцэніраванымі ўрыўкамі з асабістага жыцця драматурга і дзеямі з яго самых вядомых п'ес.

Гледачы ўбачылі ўрыўкі з камедый "Смешныя манерніцы", дзе праявілі сваё майстэрства студэнты гр. БА-23, "Скупы", дзе цудоўна сыграла сваю ролю Святлана Падвіснёва. У камедыю "Тарцюф" прынёс свой каларыт Юрый Рыдкін. Усе гледачы ад душы смяяліся ў час пастаноўкі "Мешчаніна ў дваранстве", дзе галоўныя ролі выдатна выканалі Аляксей Цярэнцьеў, Таццяна Грыневіч і Святлана Ісакава.

Але самай лепшай падзякай акцёрам было тое, што такое правядзенне заняткаў застанецца светлым успамінам аб іх гадах вучобы ва універсітэце, і аб іх выкладчыцы Алісе Аляксееўне Дарафеевай, якая і прапанавала такую цікавую форму практычных заняткаў.

**А.ЕПІШАВА, студэнтка гр. Б-22 філалагічнага факультэта.**

Традыцыі і абрады



# А Ў НАС СЁННЯ ВЯСЕЛЛЕ...

На першым курсе філалагічнага факультэта ёсць такі прадмет як фальклор. Традыцыйна студэнты па заканчэнні вывучэння гэтага курса дэманструюць святкаванне вясельнага абраду. Вось і ў гэтым годзе група РБ-13 пазнаёміла гледачоў з тым, як святкуюць вяселле на Беларусі.

Вядучымі на свяце былі студэнткі Таццяна Жыцкая і аўтар гэтых радкоў. А сярод удзельнікаў вяселля трэба адзначыць Ульяну Ільчанка (сват), Вікторыю Чапега (сваха), Вольгу Гарбачову (маці маладой), Алену Вярбоўскую (падстаўная нявеста). А ролю жаніха і нявесты выконвалі Саша Якавенка і Вольга Махунова.

Адным з асноўных элементаў вясельнага абраду быў каравай. Дзяўчатыкаравайніцы вынеслі яго на вышытым ручніку. Як звычайна на вяселлі, гучалі пажаданні шчасця і вечнага кахання маладым. А якое вяселле без песень! Іх на нашым свяце прагучала нямала.

Сярод запрошаных гасцей былі і выкладчыкі: Л.Л.Ермакова (кіраўнік гэтага мерапрыемства), У.М.Сабаленка, М.В.Родчанка, В.А.Ляшчынская.

**Наталля МАЛАШАНКА, студэнтка гр. РБ-13 філалагічнага факультэта.**

# У ІМЯ ДАБРА І МІЛАСЭРНАСЦІ

Дзесяцігадоваму юбілею Гомельскага аддзялення Беларускага дзіцячага фонду прысвяцілі сваю дабрачынную акцыю "У імя дабра і міласэрнасці" студэнты эканамічнага, гісторыка-юрыдычнага, фізічнага, філалагічнага і заочнага факультэтаў нашага універсітэта.



На здымку: першакурснікі спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" з сабранымі для дзяцей падарункамі.

Фота У.ЧЫСЦІКА.

# ПАГАДНЕННЕ ПАМІЖ РЭКТАРАТАМ ГДУ імя Ф.СКАРЫНЫ І ПРАФКОМАМ СТУДЭНТАЎ ПА САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ ПЫТАННЯХ

Дадзенае пагадненне заключана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб калектыўных дагаворах і пагадненнях..." паміж рэктаратам ГДУ ў асобе рэктара, называемага ў далейшым "рэктарат", і калектывам студэнтаў у асобе студэнцкага камітэта прафсаюзаў універсітэта, называемага ў далейшым "прафком студэнтаў".

Мэтай пагаднення з'яўляецца замацаванне нарматыўна правоў і абавязкаў студэнцкага калектыву ў цэлым і асобных яго членаў, рэктарата і прафсаюзных арганізацый у галіне вучобы, быту і адпачынку.

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Рэктарат прызнае прафком студэнтаў паўнамоцным прадстаўніком усіх студэнтаў універсітэта ў калектыўных перагаворах.

1.2. Бакі прызнаюць, што дадзенае пагадненне на ўвесь перыяд яго дзеяння мае ва універсітэце для ўсіх яго структурных падраздзяленняў і службаў, для ўсіх студэнтаў нарматыўна-абавязковую сілу, незалежна ад іх прафсаюзнага членства. Галоўнай мэтай іх сумеснай дзейнасці з'яўляецца павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў праз удасканальванне вучэбна-выхаваўчай работы, паляпшэнне арганізацыі вучэбнага працэсу, умацаванне вучэбнай дысцыпліны, рацыянальную арганізацыю працы і адпачынку студэнтаў.

1.3. Бакі абавязуюцца рабіць усё ад іх залежачае для папярэджання магчымых канфліктаў, вырашаць усе спрэчныя пытанні на падставе ўзаемнага даверу і павагі пагаджальным шляхам.

1.4. Рэктарат і прафком студэнтаў кантралююць, забяспечваюць і нясуць адказнасць за своечасовае выкананне абавязацельстваў і мерапрыемстваў, якія адносяцца да іх кампетэнцыі па дадзенаму пагадненню, і даюць справаздачу аб ходзе яго выканання на канферэнцыях або сходах студэнцкага калектыву універсітэта.

**2. Абавязкі, правы і адказнасць студэнцкага калектыву і кожнага студэнта універсітэта**

2.1. У сваёй дзейнасці калектыў ГДУ кіруецца дзеючымі законамі і нарматыўнымі актамі, загадамі і пастановамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Статутам ГДУ.

2.2. Студэнцкі калектыў і кожны студэнт універсітэта абавязуюцца:

2.2.1. Сістэматычна і глыбока авалодваць тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі па абранай спецыяльнасці, наведваць вучэбныя заняткі і выконваць ва ўстаноўлены тэрмін усе віды заданняў, прадугледжаныя вучэбнам планам і праграмамі, не парушаць правілы ўнутранага распарадку універсітэта.

2.2.2. Захоўваць чысціню на тэрыторыі універсітэта і парадак у яго памяшканнях, берагчы і захоўваць маёмасць універсітэта, беражліва адносіцца да інструментаў, абсталявання лабараторый і аўдыторый, вымяральных прыбораў, спецадзення і іншых прадметаў, якія выдаюцца ў карыстанне, эканомна і рацыянальна выкарыстоўваць энергію і матэрыялы, папярэджваць спробы крадзяжу ўласнасці універсітэта.

2.2.3. Студэнцкі калектыў і кожны студэнт мае права:

2.3.1. Карыстацца лабараторным і вучэбнадапаможным фондам універсітэта; бібліятэкай, аўдыторыямі і іншымі памяшканнямі для выканання патрабаванняў вучэбнага працэсу.

2.3.2. Займацца ў гуртках мастацкай самадзейнасці, спартыўных секцыях, карыстацца памяшканнямі універсітэта і інвентаром для гэтых мэт.

2.3.3. Згодна "Інструкцыі аб парадку назначэння і выплаты стыпендыі студэнтам вышэйшых навучальных устаноў" атрымліваць стыпендыю, якая адпавядае адзнакам, атрыманым на экзаменацыйнай сесіі.

2.3.4. Удзельнічаць у абмеркаванні, прапаноўваць змяненні і дапаўненні ў дадзенае пагадненне, патрабаваць выканання яго абавязацельстваў.

2.3.5. Звяртацца за абаронай сваіх правоў у прафсаюзны камітэт, адміністрацыйныя органы.

2.4. За нанясенне сваімі дзеяннямі і ўчынкамі матэрыяльнага ўрону універсітэту кожны студэнт нясе матэрыяльную адказнасць, прадугледжаную адпаведнымі нарматыўнымі актамі.

**3. Правы, абавязкі і адказнасць рэктарата**

3.1. Выключным правам адміністрацыі з'яўляецца: планаванне, кіраванне, арганізацыя вучэбнага працэсу, занясенне абітурыентаў у спіс студэнтаў, вырашэнне кадравых пытанняў.

3.2. Рэктарат абавязуецца:

-- у галіне сацыяльных, бытавых умоў, аховы працы і здароўя студэнтаў

3.2.1. Выплачваць дзяржаўную стыпендыю паспяваючым студэнтам згодна Інструкцыі (тэрмін: 23-25 чысла кожнага месяца).

3.2.2. Расходваць не менш 4% адлічэнняў ад універсітэцкага стыпендыяльнага фонду для заахвочвання студэнтаў за высокія вынікі ў вучобе, грамадскай і навуковай рабоце, а таксама 1,5% для аказання тэрміновай матэрыяльнай дапамогі (дадатак "Аб матэрыяльным заахвочванні студэнтаў").

3.2.3. Аказваць матэрыяльную дапамогу студэнтам пры атрыманні траўм у памеры сацыяльнай стыпендыі; смерці бацькі або маці -- у памеры вучэбнай стыпендыі.

3.2.4. Рэгуляваць вучэбны і рабочы час і час адпачынку студэнтаў універсітэта ў адпаведнасці з заканадаўствам.

3.2.5. Вызваляць студэнтаў універсітэта ад заняткаў у сувязі з ніжэйпералічанымі асабістымі абставінамі:

-- у выпадку заключэння шлюбу: самога студэнта -- 3 дні; родных братоў і сясцёр -- 1 дзень;

-- у выпадку смерці члена сям'і або бліжэйшага родзіча -- 3 дні;

-- па іншых уважлівых прычынах па рашэнню дэканата -- 1 дзень.

Пры неабходнасці ўлічваць патрабуемыя дні на дарогу.

3.2.6. Узгадняць з прафкомам адлічэнні студэнтаў з універсітэта па прычынах, не звязаных з выкананнем патрабаванняў вучэбнага працэсу.

3.2.7. Выдзяляць маючым патрэбу студэнтам месцы для пражывання ў інтэрнаце пры іх наяўнасці.

3.2.8. Праводзіць планавы рамонт інтэрнатаў і вучэбных карпусоў універсітэта.

3.2.9. Прадстаўляць прафкому студэнтаў у бясплатнае карыстанне памяшканні з усім абсталяваннем для работы самога камітэта і для правядзення сходаў (канферэнцый) членаў прафсаюза, а таксама неабходныя ў яго дзейнасці транспартныя сродкі, сродкі сувязі.

Гаспадарчае ўтрыманне, рамонт, ацяпленне, асвятленне, уборка, ахова, а таксама абсталяванне гэтых памяшканнеў праводзяцца за кошт універсітэта.

3.2.10. Праводзіць утрыманне прафсаюзных членскіх узносаў у памеры 1% ад стыпендыі і безнаяўнае іх пералічэнне праз бухгалтэрыю універсітэта на рахунак прафкома студэнтаў.

**4.Правы, абавязкі і адказнасць прафкома студэнтаў**

4.1. Прафком студэнтаў універсітэта ў сваёй дзейнасці кіруецца Статутам прафесіянальнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, законам аб прафесіянальных саюзах, законам Рэспублікі Беларусь па ахове правоў і інтарэсаў студэнтаў у галіне вучобы, быту і адпачынку, Статутам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

4.2. Прафком студэнтаў абавязуецца:

4.2.1. Садзейнічаць умацаванню вучэбнай дысцыпліны ва універсітэце, разглядаць на сваіх і сумесных з рэктаратам пасяджэннях стан гэтых пытанняў з выпрацоўкамі сумесных мер па яе ўмацаванню.

4.2.2. Арганізацыйна садзейнічаць і сумесна з дэканатамі і аддзелам выхаваўчай работы накіроўваць выхаваўчую работу студсаветаў па захаванне правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах.

4.2.3. Садзейнічаць рэктарату ў правядзенні работы па развіццю грамадскага харчавання і ажыццяўляць пастаянны студэнцкі кантроль за работай сталовай і буфетаў.

4.2.4. Аказваць садзейнічанне ў адборы і накіраванні па льготных і бясплатных пуцёўках на адпачынак і санаторна-курортнае лячэнне студэнтаў у дамы, пансіянаты, на базы адпачынку, у санаторый-прафілакторый, арганізоўваць на працягу года аздараўленне студэнтаў з дзецьмі.

4.2.5. Садзейнічаць выкананню мерапрыемстваў, накіраваных на зніжэнне захворваемасці студэнтаў універсітэта, садзейнічаць пункту аховы здароўя ў правядзенні абследаванняў членаў прафсаюза, а таксама мерапрыемстваў па прышчэпках (пастаянна).

4.2.6. Аказваць матэрыяльную дапамогу членам прафсаюза, якія маюць у ёй патрэбу, у першую чаргу студэнтам-сіротам, сямейным і малазабяспечаным студэнтам.

4.2.7. Арганізоўваць сумесна са студэнцкім клубам, спартыўным клубам, бібліятэкай культурна-масавыя мерапрыемствы, экскурсіі, наведванне тэатраў, канцэртаў, выставак.

4.2.8. Аказваць кансультацыі, юрыдычную дапамогу членам прафсаюза -- студэнтам універсітэта, прадстаўляць і абараняць іх правы і інтарэсы ў дзяржаўных і грамадскіх органах.

Пагадненне ўступае ў сілу з дня падпісання і дзейнічае да дня прыняцця наступнага.

Рэктарат і прафком студэнтаў у роўнай ступені нясуць адказнасць за выкананне ўзятых на сябе абавязацельстваў.

**"Рэктарат", рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў.**

**"Прафком студэнтаў", старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава.**

**Прынята 24 красавіка 1998 г. на прафсаюзнай канферэнцыі ГДУ.**

# ПАЛАЖЭННЕ АБ МАТЭРЫЯЛЬНЫМ ЗААХВОЧВАННІ

1.З мэтай стымулявання поспехаў студэнтаў у вучобе, навуковай рабоце і грамадскім жыцці універсітэта, узмацнення іх матэрыяльнай зацікаўленасці і адказнасці за выкананне даручанай работы ўстанаўліваць надбаўкі да стыпендый.

2. Надбаўкі да стыпендый устанаўліваюцца студэнтам за асаблівыя поспехі ў вучобе, навуковай і грамадскай рабоце ў працэнтах да мінімальнай вучэбнай стыпендыі:

-- студэнтам, якія атрымліваюць імянныя стыпендыі, а таксама паспяваючым студэнтам за асаблівыя поспехі ў вучобе (выдатныя адзнакі на працягу двух апошніх семестраў), у навуковай і грамадскай рабоце -- 50%;

-- паспяваючым студэнтам (з сярэднім балам ад "5" да "4") за поспехі ў вучобе, удзел у навуковай і грамадскай рабоце, спартыўна-масавых мерапрыемствах, мастацкай самадзейнасці -- 35%;

-- студэнтам, якія паспяхова сумяшчаюць вучобу ва універсітэце з удзелам у грамадскай рабоце ( па прадстаўленню дэкана і прафсаюзнай арганізацыі факультэта або прафкома універсітэта), -- 25%.

3. Надбаўкі да стыпендый устанаўліваюцца загадам рэктара універсітэта па ўзгадненню з прафсаюзнай арганізацыяй факультэта (універсітэта) на падставе пратакола пасяджэння стыпендыяльнай камісіі на семестр.

4. За парушэнне вучэбнай дысцыпліны (пропускі вучэбных заняткаў без уважлівых прычын, парушэнне правілаў унутранага распарадку універсітэта і г.д.) па прадстаўленню дэканата студэнты могуць быць пазбаўлены надбаўкі загадам рэктара часова або да канца семестра.

5. Для ўстанаўлення надбавак за асаблівыя поспехі ў вучобе, грамадскай і навуковай рабоце ствараецца фонд у памеры 4% планавага стыпендыяльнага фонду за кошт сродкаў бюджэту.

6. Студэнты-пераможцы аглядаў-конкурсаў, алімпіяд, спартыўных мерапрыемстваў, а таксама студэнты, якія асабліва вызначаліся ў грамадскай рабоце, могуць быць заахвочаны грашовай прэміяй па прадстаўленню асобаў, адказных за правядзенне мерапрыемстваў, або па прадстаўленню прафкома студэнтаў універсітэта па ўзгадненню з дэканам факультэта за кошт эканоміі стыпендыяльнага фонду.

## ГАЛОЎНАЕ -- САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА СТУДЭНТАЎ

Рэгулярна ва універсітэце праводзіцца прыём студэнтаў па пытаннях, якія іх цікавяць, і даюцца абгрунтаваныя нарматыўнымі дакументамі адказы і кансультацыі. Дзейнічае Пагадненне паміж адміністрацыяй і прафсаюзным камітэтам па сацыяльна-эканамічных пытаннях, якое змяшчае раздзелы, што датычацца асноўных сфер жыццядзейнасці студэнтаў:

а) вучэбна-вытворчыя пытанні;
б) матэрыяльнае забеспячэнне студэнтаў;
в) вучэбная, працоўная дысцыпліна;
г) ахова працы і здароўя студэнтаў;
д) жыллёва-бытавыя пытанні;
ж) культурна-масавая і спартыўна-масавая работа.

Прадстаўнікі прафкома прымаюць удзел у рабоце рэктарата, Савета універсітэта, саветаў факультэтаў, універсітэцкіх камісій, дзейнасць якіх закранае інтарэсы студэнцтва, удзельнічаюць у распрацоўцы адпаведных нарматыўных дакументаў.

За актыўны ўдзел у прафсаюзнай рабоце і высокія паказчыкі ў вучобе на ІІ семестр 1997-98 навучальнага года назначаны прафсаюзныя стыпендыі (даплата да вучэбнай):

абкома прафсаюза -- Андрэю Кражаву, ІІ курс гісторыка-юрыдычнага факультэта -- 2 мін.з/п;

прафкома студэнтаў -- Алене Саўчанка, IV курс геолага-геаграфічнага факультэта -- 1 мін.з/п;

Людміле Сарока, ІІІ курс фізічнага факультэта -- 1 мін.з/п.

Прафком студэнтаў (прадстаўнікі) прымаў ўдзел у распрацоўцы дагавора на аздараўленне студэнтаў да 18 гадоў праз санаторый-прафілакторый за кошт Фонду ЧАЭС, дакументаў па функцыянiраванню санаторыя-прафілакторыя ў 1998 годзе, у адборы студэнтаў у санаторый-прафілакторый. Са студзеня 1998 г. аздароўлена студэнтаў: да 18 гадоў -- 217, старэй 18 гадоў -- 517, у тым ліку бясплатна выдадзена 319 пуцёвак.

Прафкомам падтрымліваюцца ўсе мерапрыемствы спартыўнага характару. Яго прадстаўнікі на спаборніцтвах праводзяць узнагароджанне пераможцаў.

На правядзенне забаўляльных мерапрыемстваў, якія праводзіліся культурным цэнтрам, аддзелам выхаваўчай работы, самастойна прафкомам, факультэтамі выдзяляліся фінансавыя сродкі (пасвячэнне ў студэнты -- "Дзень ведаў", "Дзень студэнта", вечар, прысвечаны прафілактыцы СНІДу, навагодні вечары, вечар спартыўнай славы, 8-ае Сакавіка, "Містэр універсітэта", вечары факультэтаў і г.д. У цэлым за 1997 год на гэтыя мэты было зрасходавана 87 млн.руб.

Вялося актыўнае супрацоўніцтва з іншымі арганізацыямі: аддзелам па выхаваўчай рабоце, прафкомам выкладчыкаў і супрацоўнікаў, вышэйстаячымі прафсаюзнымі арганізацыямі -- АК, БРК, Федэрацыяй (старшыня па працягу года выступала на двух пленумах -- БРК і Федэрацыі); прымаўся ўдзел у рэспубліканскіх семінарах. Адзін з іх быў праведзены на базе ГДУ.

Аказвалася дапамога ў стварэнні БПСМ; -- распаўсюджваліся білеты ў тэатр, філармонію.

Прадстаўнікі прафкома ўдзельнічалі ў афіцыйных мерапрыемствах (ускладанне кветак, святочныя вечары, рытуальныя святы і г.д.), прысвечаных дзяржаўным святам і памятным датам (Дню рэспублікі, Дню абароны Айчыны);

-- аказана матэрыяльная дапамога на суму 18900000 у 1997 г.;

-- прафком студэнтаў курыруе студэнтаў-сірот -- 42 чал.

На ІІ квартал 1998 года студэнтам выдзелены пуцёўкі:

санаторый "Пралеска" (захворванні сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм) з 23 чэрвеня па 16 ліпеня;

санаторый "Будаўнік" (в.Нарач) дзве пуцёўкі з 15 чэрвеня 8 ліпеня;

санаторый "Вясна" (г.Трускавец) (захворванні мочапалавой сістэмы) з 11 чэрвеня па 4 ліпеня;

санаторый "Чонкі" (захворванні сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм) з 1 па 24 чэрвеня;

санаторый "Алеся" (Брэсцкая вобл.) (захворванні органаў дыхання) з 27 чэрвеня па 14 ліпеня;

санаторый імя Леніна (г.Бабруйск) (захворванні органаў стрававання) --дзве пуцёўкі з 27 чэрвеня па 20 ліпеня;

санаторый "Прыдняпроўскі" (г.Рагачоў) (захворванні апорна-рухальнага апарату) з 25 чэрвеня па 18 ліпеня;

санаторый "Лётцы" (Віцебская вобл.) (захворванні сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм) --дзве пуцёўкі з 17 чэрвеня па 10 ліпеня і з 25 чэрвеня па 18 ліпеня.

**Н.КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў.**

## НЕ ПАДВЯРГАЙЦЕ СЯБЕ НЕБЯСПЕЦЫ

**Актуальная праблема**

Па ацэнцы праграмы ААН/СНІД, на сённяшні дзень у свеце налічваецца 29,4 млн. ВІЧ-інфіцыраваных, з іх 2,6 млн. дзеці і падлеткі. У Беларусі сітуацыя па ВІЧ/СНІДу працягвае пагаршацца. У параўнанні з мінулым годам колькасць зарэгістраваных ВІЧ-інфіцыраваных у рэспубліцы на канец лістапада 1997 г. падвоілася і склала 1700 чалавек. Рэальная ж іх колькасць большая ў 10 разоў. Прычым, 80% ВІЧ-інфіцыраваных -- ва ўзросце 14-29 гадоў.

Асноўная прычына распаўсюджвання хваробы -- наркаманія. Яна паражае, як правіла, самую квітнеючую частку нашага грамадства -- моладзь.

У нашай рэспубліцы па прычыне ВІЧ-інфіцыравання знаходзіцца пад дынамічным назіраннем урачоў-спецыялістаў 15 дзяцей, а таксама 20 жанчын, хворых на СНІД, якія выказалі жаданне раджаць. На жаль, да трох гадоў немагчыма выявіць, ці ўнаследавала дзіця ВІЧ-інфекцыю. У 1997 г. адно дзіця памерла ад СНІДу.

Расце і колькасць ахвяр венерычных захворванняў. Так у 1997 г. на Гомельшчыне імі хварэла больш 3,5 тыс: чалавек. У параўнанні з мінулым годам рост склаў 10%.

Заўважаецца недахоп асветніцкай работы ў школах, ПТВ, ВНУ. Нездарма сярод навучэнцкай моладзі вобласці зарэгістравана 25 выпадкаў вострага сіфілісу, 15 з іх прыходзяцца на горад Гомель. У цэлым жа па статыстыцы кожная 12-я ахвяра "Венеры" яшчэ не дасягнула паўналецця.

Умовы, якія склаліся для аховы здароўя і грамадства ў цэлым, патрабуюць высокага прафесіяналізму ў рабоце медыкаў, якія і выконваюць свае абавязкі з захаваннем пэўных правіл і мер засцярогі. Гэтым дасягаецца бяспека пры аказанні медыцынскай дапамогі. Але толькі праінфармаваны і абучаны чалавек сам, і толькі сам, можа пазбегнуць заражэння вірусам.

Кожны год Сусветная арганізацыя аховы здароўя аб'яўляе 1-е снежня Днём барацьбы са СНІДам. Аднак змагацца з гэтым грозным захворваннем трэба кожны дзень і не толькі медыцынскім работнікам. Сучасная медыцына не мае вакцыны супраць СНІДу. Папярэджанне захворвання залежыць ад паводзін кожнага з нас. Нездарма СНІД называюць хваробай паводзін, хоць дакладней было б яго назваць хваробай нізкага маральнага ўзроўню. Часта размовы аб пагрозе распаўсюджання СНІДу зводзяцца да недахопу прэзерватываў, аднаразовых шпрыцаў, іншага медыцынскага інструментарыя і абсталявання. А між іншым, не меншую небяспеку ўяўляюць адсутнасць культуры палавога жыцця, сексуальная непісьменнасць.

Ніякія абмежаванні ці забароны не спыняць гэтую хваробу. Толькі ад паводзін кожнага залежыць быць ці не быць СНІДу.

**С.ЗАЛАТЫХ,**
**галоўны ўрач**
**санаторыя-прафілакторыя.**

**МИР ЦВЕТОВ -- МИР ПРЕКРАСНОГО**

## *И Р И С*



Это символ мужества, достоинства, отваги, прямоты, благородства, воинской доблести. Солдаты дореволюционной Франции перед битвой несли голубой королевский флаг с изображением трех золотых ирисов. Их изображения украшали королевские доспехи, одежды, предметы обихода. В Японии ежегодно 5 мая во время национального праздника Дня мальчиков ирисами украшают жилища, а в пору их массового цветения совершают "ханами" -- ритуальное созерцание цветов, вселяющих радость и наслаждение.

В культуре ирисы известны свыше 2 тысяч лет. Изображение ириса украшало герб Флоренции, окруженной полями возделываемого белого ириса. Красота их цветов вдохновляла художников средних веков и эпохи Возрождения -- ирисы можно встретить на картинах и иконах тех времен. К настоящему времени селекционеры создали около 30000 сортов ирисов и они занимают одно из первых мест в мире среди декоративных растений. Существуют клубы любителей ирисов, выпускаются специальные журналы, создаются моносады из ирисов -- иридарии. Широкому распространению ирисов способствует возможность использования ароматических вытяжек из корневищ и цветков в парфюмерии, виноделении и кондитерской промышленности.

Цветок ириса необычен по конструкции. Шесть его лепестков, срастаясь в основании, образуют трубочку, а затем располагаются в пространстве на двух уровнях: три поднимаются вверх и смыкаются, образуя конус, а три отгибаются вниз. Окраска лепестков неоднородна -- синие тона пронизываются сетью другой окраски -- желтой, карминной, голубовато-черной. Всех оттенков и сочетаний цвета у ирисов встречаются около 300. Отсюда и его название в переводе с греческого -- "радуга". Палитру красок нижних лепестков дополняют волоски разных оттенков -- своеобразная "ковровая дорожка" -- путь к нектару. Обычно тяжелый шмель садится на лепесток и движется по ней за сладкой жидкостью. В это время к его спине плотно прижимает тычинку рыльце пестика в виде узкого лепестка. Вымазавшись пыльцой, насекомое улетает опылять другой цветок.

Ирисы -- "мужские" цветы и дарят их обычно юношам, мальчикам. Композициями из ирисов можно украсить любой современный интерьер. Срезают ирисы, когда распустится первый верхний цветок. Для букета можно использовать даже один цветок ириса в сочетании с мелкими белыми цветками и ажурными листьями аранжировочной зелени. Однако более нарядны букеты, где сочетаются ирисы разных окрасок, например, голубые и белые, сиреневые и белые, лиловые и желтые. Интересны сочетания лиловых с желтой вазой, белых -- с красной. Ставят ирисы в воду не глубже 5-8 см. Концы стеблей нужно поцарапать иглой. По правилам японской икебаны ирисы ставят в низких широких вазах на металлических наколках группами. Цветок поворачивают к зрителю лицевой стороной, то есть одним из трех нижних лепестков, а не промежутком между ними. Листья поворачивают плоской стороной, а не острой. В современной икебане ирисы сочетают с лилиями и другими звездчатыми цветами.

Дикорастущие ирисы распространены по всем континентам, исключая районы Крайнего Севера таежной зоны Евразии. В Беларуси встречаются три вида ирисов-касатиков по сырым берегам рек, озер, по кустарникам, сырым лугам, лесным лужайкам. Все они занесены в Красную книгу. Эти притягательные цветы, хотя и окружены листьями-мечами, хрупки и беззащитны и требуют к себе внимания и самого бережного отношения.

**Р.МАРКЕЛОВА, доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

## СІЛЫ ЁСЦЬ У ВЕТЭРАНАЎ

У нямецкім горадзе Кёльне адбылося першынство Еўропы па цяжкай атлетыцы сярод ветэранаў. Барацьбу за ўзнагароды вялі 660 асілкаў. Адна трэцяя з іх -- немцы. Нешматлікім было прадстаўніцтва ад Беларусі. Гэта -- мінчане і толькі адзін ветэран з Гомеля: майстар спорту дацэнт кафедры філасофіі А.А.Фяськоў.

Спаборніцтвы праводзіліся ў 8 узроставых катэгорыях ад 40 да 70 гадоў.

А.А.Фяськоў выступаў сярод тых, чый узрост перавысіў 60 гадоў у вазе да 85 кг. Яго сапернікамі былі 17 спартсменаў. Наш цяжкаатлет паказаў шосты вынік і ўдастоены Дыплома.

Сёлета ў канцы лета ў ЗША адбудзецца Алімпіяда ветэранаў. На памост ад штангістаў Беларусі выйдзе і А.А.Фяськоў.


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не утрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 271.
Падпісана да друку 12.06.98.